# ДЗЕСЯТАЙ ПЯЦІГОДЦЫ—ПЕРАМОЖНЫ ФІНІШ, XXVI З'ЕЗДУ КПСС—ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1980 г.
20
ЛІСТАПАДА
ЧАЦВЕР
№ 31 (1295)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

ЛЕНІНСКІ СТЫПЕНДЫЯТ



## АПАНТАНАЯ МАРАЙ

ПЕДПРАКТЫКА, ПЕРШЫ ЎРОК... Здаецца, гэта самы цяжкі экзамен з усіх, што былі за чатыры гады вучобы. Тут ужо не ты атрымліваеш веды, тут ты павінен аддаць іх гэтым непаседлівым, такім розным хлапчукам і дзяўчынкам, што з цікавасцю глядзяць зараз на цябе. Ці знойдзеш ты тое галоўнае, што дазволіць ім прызнаць цябе «сваёй», паверыць твайму слову?

...Самы «цяжкі», як характарызавалі, яе 7-ы клас аказаўся зусім не цяжкім. Жаніны сямікласнікі аказаліся дапытлівымі, імкнуліся правільна адказаць на пытанні практыканткі, без памылак напісаць сачыненне. І была радасць— значыць, у мяне атрымліваецца, значыць, магу быць настаўніцай...

Яна прыехала ў Мінск з Баранавіч, дзе пасля заканчэння школы працавала на швейнай фабрыцы.

Выхоўвалася ў сям'і выкладчыкаў — хутчэй за ўсё гэта і вызначыла для яе выбар прафесіі: дзяўчына заканчвае V курс філфака БДУ аддзялення рускай мовы і літаратуры. Выдатніца, ленінскі стыпендыят.

...У Жаны Малай шмат захапленняў. Вельмі любіць музыку (скончыла музычную школу па класу скрыпкі), сярод усіх відаў мастацтва перавагу аддае балету (сама некалі займалася ў харэаграфічнай студыі), стараецца не прапусціць ніводнай новай пастаноўкі ў тэатры, шмат чытае. І ўсё гэта ніколькі не перашкаджае ёй добра вучыцца, весці грамадскую работу.

— Складанага пераходу ад школы да ВНУ не было, тым больш, што дапамагло падрыхтоўчае аддзяленне універсітэта, на якім займалася перад паступленнем,— гаворыць Жана.— Філфак і педагогіка? Такое спалучэнне можа тлумачыцца тым, што мова для мяне — цудоўны матэрыял для аналізу, у ёй я знаходжу пажытак для розуму. І да таго ж вельмі люблю дзяцей, вось і хочацца навучыць іх па-сапраўднаму разумець роднае слова.

З другога курса дзяўчына выконвала абавязкі спачатку члена студэнцкага навуковага таварыства, потым сакратара і нарэшце стала яго старшынёй. Навука захапляе студэнтку не толькі перспектывай даведацца аб чымсьці новым і невядомым, але і магчымасцю праверыць сябе, свае сілы. Тут шырокае поле для зносін як са студэнтамі, так і з выкладчыкамі. У час вучобы даводзілася выступаць і з навуковымі дакладамі, рыхтаваць рэфераты, праводзіць семінары. Напрыклад, у мінулым годзе на навуковай канферэнцыі ў Ленінградзе Жана Малая прадстаўляла сваю работу «Сацыялінгвістыка — мова і грамадства». Пастаянна працуючы ў галіне сінтаксісу моўнай дзейнасці, яна і тэму дыпломнай выбрала аналагічную: «З'явы семантычнага багацця ў мове (на ўзроўні выказвання)».

Працоўны дзень Жаны цалкам запоўнены. З раніцы — заняткі, грамадская работа, а яна яшчэ і староста групы, акрамя таго, ужо зараз трэба падрыхтаваць сабе змену ў СНТ («не магу ж я проста так здаць абавязкі, трэба ўвесці ў курс спраў, паказаць, што і як...»), бібліятэка...

Хутка абарона дыпломнай работы, канец вучобы, самастойная праца. А да яе Жана падрыхтавалася, бо яна адносіцца да тых людзей, якія, апантаныя марай, заўсёды дабіваюцца сваёй мэты.

С. ІВАНОВА.

"Беларускі універсітэт"

## ТЭЛЕТАЙП

• Учора • Сёння • Заўтра •

### СВЯТОЧНЫ КІНАВЕЧАР

адбыўся нядаўна ў кінатэатры «Кастрычнік». Ён прысвячаўся Міжнароднаму дню студэнтаў. Арганізаваны Мінскім гаркомам ЛКСМБ і камітэтам камсамола БДУ імя У. І. Леніна, гэты вечар ператварыўся ў сапраўднае свята маладосці. На ім прысутнічалі як савецкія, так і замежныя студэнты, якія навучаюцца зараз ва універсітэце. Прысутныя цёпла сустрэлі выступленні Васілія Дзімітраса з Грэцыі, Андрэаса Фельске з ГДР і іншых замежных студэнтаў, якія павіншавалі моладзь са святам і пажадалі поспехаў. Потым перад удзельнікамі святочнага кінавечара выступілі самадзейныя выканаўцы, лаўрэаты конкурсу палітычнай песні БДУ імя У. І. Леніна Алег Ацьман і Уладзімір Васіленка.

С. ЛЫСКАВЕЦ.

### НА ХІМФАКУ АДБЫЛАСЯ

сустрэча студэнтаў малодшых курсаў з супрацоўнікамі кафедр. Сустрэча праходзіла ў лабараторыі кафедры фізічнай хіміі. Яна была арганізавана НСС хімфака і мела мэтай азнаёміць студэнтаў 1 і 2 курсаў з работамі, якія вядуцца на кафедрах.

На сустрэчу са студэнтамі прыйшлі прафесар кафедры фізічнай хіміі, доктар хімічных навук Г. Я. Кабо, дацэнты кафедры фізічнай хіміі Н. Г. Рафальскі і Л. А. Мячкоўскі, кандыдат хімічных навук М. П. Гілевіч, кафедру тэарэтычнай хіміі і НДІ ФХП прадстаўляў кандыдат хімічных навук С. К. Рахманаў, кафедру радыяцыйнай хіміі — малодшы навуковы супрацоўнік В. Г. Касабуцкі, лабараторыю хіміі цэлюлозы НДІ ФХП — малодшы навуковы супрацоўнік Л. Г. Лушчык.

Студэнты даведаліся аб рабоце лабараторый хімічнага факультэта і НДІ ФХП і некаторыя з іх выказалі жаданне займацца ў СНТ на адной з кафедр.

А. ВЕЧАР,
член камітэта камсамола хімфака.

### НА ПАСЯДЖЭННІ РЭКТАРАТА

разгледжана пытанне аб рабоце кафедры педагогікі. Прысутныя абмеркавалі комплекс задач па далейшаму ўдасканаленню метадычнай, навуковай, вучэбнай і выхаваўчай дзейнасці кафедры.

Г. БЯЛЬКЕВІЧ.

### У ПЕРШАКУРСНІКАЎ

факультэта журналістыкі адбылося свята. Вечар, які прайшоў на журфаку ў мінулую суботу, прысвячаўся ім. Яркія фотагазеты, плакаты, пажаданні — усё гэта спрыяла добраму настрою ўдзельнікаў вечара. Першакурснікі прынялі клятву журналіста, якую зачытаў сакратар камітэта камсамола Сяргей Багдановіч.

І. НІКАЛАЙЧУК,
намеснік сакратара камітэта камсамола факультэта журналістыкі.

КАРЫСНА ВЕДАЦЬ

# Вучыся вучыцца

**НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ** веданне замежных моў і ўменне практычна прымяняць іх у той ці іншай сферы дзейнасці стала неад'емнай асаблівасцю кваліфікаванага спецыяліста. Той, хто не ведае замежнай мовы, напэўна, ужо шмат разоў трапляў у нялоўкае становішча: ці сустрэнецца ён з замежным госцем у ВНУ, ці, наадварот, давядзецца яму самому пабываць за мяжой — ён адчувае сябе бездапаможным. Даводзіцца звяртацца да перакладчыка, а пры гэтым можна страціць значную частку інфармацыі.

У апошні час шмат пішуць аб так званых паскораных метадах навучання замежным мовам. Спасылаючыся, аднак, на відавочныя поспехі вывучэння замежных моў пры дапамозе паскораных метадаў, не трэба забывацца, што вучацца па гэтых метадах энтузіясты сваёй справы. Метад, які б прымусіў хацець вывучаць замежную мову, на жаль, пакуль не вынайдзены.

Зацікаўленасць у вывучэнні замежнай мовы — неабходная ўмова для паспяховага авалодання ёю любым метадам. Трэба заўсёды памятаць, што дзеяслоў «вучыцца» не дарэмна азначае ў мове «вучыць сябе». Адукацыя тым больш эфектыўная, чым больш студэнт зможа навучыць сябе. Гэта патрабуе выхавання вядомай дысцыпліны вучэння, дысцыпліны працы.

Вучэбнай мэтай ВНУ нямоўнага профілю з'яўляецца фарміраванне ўменняў двух напрамкаў — умення разумець літаратуру па спецыяльнасці і ўмення гутарыць на агульныя тэмы і тэмы спецыяльнасці на замежнай мове. У адрозненне ад сярэдняй школы навучанне замежнай мове ў ВНУ патрабуе большай актыўнасці, ініцыятывы і самастойнасці.

Практыка паказвае, што большасць студэнтаў не могуць працаваць самастойна па замежнай мове: яны не ведаюць, як трэба карыстацца слоўнікам і граматычнымі даведнікамі так, каб на гэта ішло менш часу, не могуць працаваць над тэкстамі ў залежнасці ад іх прызначэння і характару, што вядзе да выкарыстання такіх прыёмаў, якія не могуць забяспечыць поспеху і, значыць, выклікаць стаючыя адносіны да чытання на замежнай мове.

Навучанне чытанню — інфармацыйнаму, бесперакладнаму — складаная задача. Яна рашаецца на працягу чатырох гадоў як на абавязковых, так і на факультатыўных занятках, якія падводзяць студэнтаў да далейшай самастойнай работы з літаратурай.

Для аблягчэння запамінання вучэбнага матэрыялу можна прапанаваць студэнтам надаць сшытку функцыю даведніка па замежнай мове. Усе кампактна запісаныя матэрыялы патрэбна мець пры сабе заўсёды, каб карыстацца імі ў любую вольную хвіліну. Вельмі часта чалавек і не падазрае, якія вялікія рэзервы часу ён можа выкарыстоўваць для вывучэння замежнай мовы (паездкі ў транспарце, чарга, чаканні і г. д.).

Займацца замежнай мовай трэба рэгулярна, кожны дзень па паўгадзіны, а не сем гадзін раз у тыдзень. Вельмі важна гаварыць на вывучаемай мове пры любой магчымасці, не саромеючыся няпоўнага ведання. Лепш гаварыць з памылкамі, чым граматна маўчаць.

Важна, каб выкладчыкі спецыяльных дысцыплін патрабавалі ад студэнтаў чытання замежнай літаратуры пры падрыхтоўцы да лекцый, семінараў і практычных заняткаў, пры рабоце над курсавымі і дыпломнымі работамі. Неабходна, каб студэнты на ўласным вопыце пераканаліся ў тым, што замежная мова неабходна ім для авалодання спецыяльнасцю — як у сценах універсітэта, так і пасля яго заканчэння.

**С. ЛУЗГІНА,**
**загадчык кафедры англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў.**



**НА ЗДЫМКУ: заняткі на філалагічным факультэце ў аўдыторыі імя Я. Коласа.**
**Фота М. ДУБОВІКА.**

# З паўвекавым юбілеем!



**Сакратарыят праўлення Саюза пісьменнікаў СССР і савет па беларускай літаратуры накіравалі Паўлу Іванавічу ТКАЧОВУ прывітанне:**

«Юнацтву нашай краіны, савецкай школе, якая выхоўвае заўтрашніх будаўнікоў камунізму, непарыўнай сувязі пакаленняў прысвечана Ваша творчасць.

Вашы кнігі, якія расказваюць аб гераізме рэвалюцыйных барацьбітоў, дапамагаюць расціць нашых юных грамадзян сапраўднымі патрыётамі, людзьмі ідэйна стойкімі, гатовымі да барацьбы за вялікія ленінскія ідэалы.

Самая яркая і значная старонка Вашай творчай біяграфіі — стварэнне твораў аб Уладзіміру Ільічу Леніне, аб рэвалюцыянерах-ленінцах. Значным поспехам карыстаюцца Вашы кнігі «Вишневый цвет», «Имя Ленина в сердце нашем», «Сердце коммунара» і іншыя.

Мы цэнім і Вашу педагагічную дзейнасць. Будучы загадчыкам кафедры рускай класічнай літаратуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, Вы шмат сіл і энергіі аддаеце выхаванню маладых філолагаў».

* * *

**Рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» далучаецца да гэтага віншавання і жадае юбіляру новых творчых здзяйсненняў.**

# АКЦЭНТ НА ЯКАСЦЬ І ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ

**ВЫКОНВАЕМ ПАСТАНОВУ СХОДУ ПАРТЫЙНАГА АКТЫВУ**

РАШЭННІ СХОДУ ПАРТЫЙНАГА АКТЫВУ універсітэта ад 3 чэрвеня гэтага года разглядаюцца на фізічным факультэце як шырокая праграма інтэнсіфікацыі і павышэння эфектыўнасці вучэбнага працэсу і навуковага пошуку.

Прайшло пяць месяцаў. Тэрмін невялікі, але дастатковы, каб даць справаздачу грамадскасці, як выконваюцца рашэнні сходу партыйнага актыву.

Галоўны наш клопат — удасканаленне вучэбнага працэсу і выхаваўчай работы са студэнтамі.

На факультэце распрацаваны комплексны план выхаваўчай работы, да выканання якога прыцягнуты шырокі актыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў, студэнтаў і аспірантаў. Асаблівая ўвага ўдзяляецца пытанням светапогляднай накіраванасці вучэбна - выхаваўчага працэсу. Павышэнню ўзроўню вучэбнай, навуковай і выхаваўчай работы садзейнічае творчае супрацоўніцтва з навуковымі ўстановамі і прамысловымі прадпрыемствамі. За апошні час фізічны факультэт значна расшырыў свае сувязі з інстытутамі АН БССР і прамысловымі прадпрыемствамі рэспублікі.

Вядзецца вялікая работа па развіццю і паглыбленню зместу вучэбна - навукова - вытворчых аб'яднанняў з ВА «Інтэграл» і аддзяленнямі фізіка-матэматычных і фізіка - тэхнічных навук АН БССР. Распрацаваны ці знаходзяцца ў стадыі дапрацоўкі доўгатэрміновыя праграмы супрацоўніцтва факультэта з НДІ АН БССР (фізікі, цепла- і масаабмену, ядзернай энергетыкі, фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў).

Вялікую ўвагу мы сталі ўдзяляць узаемадзеянню кафедр як у вучэбным працэсе, так і ў навуковай рабоце. Міжкафедральнае супрацоўніцтва, якое грунтавалася, як правіла, на ўласнай ініцыятыве, набыло арганізацыйную форму міжкафедральных вучэбна - навуковых лабараторый. Стварэнне іх дазваляе эфектыўней выкарыстоўваць каштоўнае абсталяванне, павысіць узровень навуковых распрацовак, адкрые для студэнтаў доступ да навейшых прылад, што садзейнічае павышэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў.

Адзін з паказчыкаў дзейнасці факультэта — аўтарскія пасведчанні на вынаходніцтвы, публікацыі. За 10 месяцаў 1980 года выкладчыкамі, супрацоўнікамі і студэнтамі факультэта накіравана ў друк больш як 320 артыкулаў, пададзена 61 заяўка на вынаходніцтвы, атрыманы 44 станоўчыя рашэнні на выдачу аўтарскіх пасведчанняў. Многія з іх адносяцца да такіх навейшых галін фізікі, як спектраскапія электронна - парамагнітнага рэзанансу, кіраванне патокамі высокаэнергетычных выпраменьванняў, а таксама электроннае прыладабудаванне.

Наогул больш 80 працэнтаў тэм прыкладнога характару выканана на ўзроўні вынаходніцтваў.

У 1980 годзе пяць вынаходніцтваў супрацоўнікаў кафедры агульнай фізікі ўкаранёна ў вучэбны працэс, шэсць вынаходніцтваў выкарыстаны ў іншых арганізацыях. Эканамічны эфект ад навукова - даследчых работ, распрацаваных за гэты год на факультэце, пры плане 197 тысяч ужо склаў 391 тысячу рублёў.

Удзел факультэта ў комплексных праграмна - мэтавых распрацоўках адкрывае у XI пяцігодцы яшчэ больш шырокія магчымасці для рашэння складанай праблемы ўкаранення.

Разумеючы, што далейшае развіццё факультэта, яго навуковы патэнцыял, узровень падрыхтоўкі спецыялістаў-фізікаў вызначаюцца саставам выкладчыкаў і навуковых работнікаў, мы пастаянную ўвагу ўдзяляем кадравай палітыцы. Застой у абаронах доктарскіх дысертацый факультэт рашуча пераадолеў. 10 снежня адбудзецца абарона доктарскай дысертацыі дацэнта кафедры агульнай фізікі Л. М. Баркоўскага. Аналіз становішча справы з падрыхтоўкай спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі паказвае, што ў наступнай пяцігодцы будзе абаронена яшчэ не менш 4 доктарскіх дысертацый.

Фізічны факультэт добра папрацаваў у працоўным семестры. Першае месца сярод факультэтаў па выніках сельскагаспадарчых работ і трэцяе месца па выніках работ у СБА аб многім гаворыць. Але яшчэ красамоўней сведчаць лічбы: 1,4 млн. рублёў асвоена СБА фізічнага факультэта, выбрана 11 тысяч тон бульбы, дадзена 240 канцэртаў, прачытана 484 лекцыі...

Нельга сказаць, што ў рабоце фізічнага факультэта няма праблем, што дасягнутыя поспехі з'яўляюцца нейкай вяршыняй. На факультэце яшчэ шмат непаспяваючых студэнтаў, патрэбна значна ўдасканаліць выхаваўчую работу. Факультэт мае патрэбу ў павелічэнні лабараторных плошчаў.

Адсутнасць механічнай майстэрні не дазваляе своечасова мадэрнізаваць вучэбныя лабараторныя работы, аператыўна ўкараняць задумы ў рэальны макет, перашкаджае развіццю творчых навыкаў у студэнтаў.

Зараз, фарміруючы план на XI пяцігодку, усе свае дасягненні і недахопы мы разглядаем як матэрыял для крытычнага аналізу, які дазволіць зрабіць нашу работу больш эфектыўнай.

**Э. ШПІЛЕЎСКІ,**
**дэкан фізічнага факультэта.**

# НАРОД БЕЗ РАДЗІМЫ

У ГЭТЫМ ДОПІСЕ я хачу расказаць савецкім і замежным студэнтам пра сваю нацыю, пра народ, які не мае радзімы.

Курды — старажытная нацыя, з багатай гісторыяй і культурнай спадчынай. Як этнічная супольнасць курды існуюць тры тысячагоддзі. За гэты час на тэрыторыі Курдыстана не адзін раз паяўляліся курдскія дзяржавы з высокаразвітай культурай. Яны ўнеслі свой уклад у сусветную гісторыю. Дастаткова ўспомніць Мідзію, дзяржавы Нахры, Азідзіна Шэра. Пасля таго як Асманская імперыя падпарадкавала сваёй уладзе амаль увесь Блізкі Усход, у гістарычным развіцці курдаў наступіў цяжкі перыяд. Абвастрыліся сацыяльныя праблемы, абумоўленыя нацыянальным прыгнётам.

Да 1922 года курды жылі на адной тэрыторыі, мелі сваю дзяржаву. Дагавор «Поўнач», які быў заключаны ўрадам Камаля Атацюрка з Англіяй і Францыяй, адбіўся на лёсе курдскага народа. Канкурэнцыя паміж вядомымі капіталістычнымі дзяржавамі, паміж двума буйнейшымі каланіяльнымі драпежнікамі была ліквідавана за кошт курдаў, іх нацыянальнай і тэрытарыяльнай незалежнасці. Адзін з пунктаў дагавора «Падзяляй і пануй» раздзяліў Курдыстан на чатыры часткі. Адна з іх адышла да Турцыі, тры іншыя— да Ірана, Ірака і Сірыі. Але курды не хацелі мірыцца з гэтым. Яны ўзняліся на барацьбу за аб'яднанне і стварэнне ўласнай незалежнай дзяржавы. У 1923 годзе такая дзяржава была створана: на тэрыторыі Ірака паявілася рэспубліка Сулейманія. Яе ўзначаліў Махмуд Хафід. У. І. Ленін у сваім пісьме да курдскага народа вітаў утварэнне рэспублікі. Аднак англійскія войскі патапілі ў крыві маладую дзяржаву, якая нават не праіснавала і трох месяцаў.

У 1946 годзе ўжо на іранскай тэрыторыі ўзнікла першая сацыялістычная рэспубліка на

## ● З НАШАЙ ПОШТЫ

Блізкім Усходзе — Махабар. Менш чым праз год англійскі капітал задушыў рэспубліку.

Цяпер у свеце налічваецца каля 22 мільёнаў курдаў. Аднак толькі ў Савецкім Саюзе, дзе жыве 300 тысяч курдаў, ім гарантаваны ўсе правы і свабоды. Яны — паўнапраўныя гаспадары краіны. У СССР выдаюцца газеты і часопісы, вядуцца радыё- і тэлеперадачы на курдскай мове, адкрыты нацыянальныя школы, ёсць некалькі нацыянальных фальклорных курдскіх ансамбляў.

**М. ХУСЕІН,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

РЭЙД

# ЗІМА СПЫТАЕ СТРОГА

З КОЖНЫМ ГОДАМ паляпшаюцца ўмовы жыцця студэнтаў у інтэрнатах. Гэта пацвердзіў і рэйд сектара быту групы народнага кантролю універсітэта. Стан інтэрнатаў і іх гатоўнасць да эксплуатацыі ў зімовых умовах — вось галоўная мэта праверкі.

У дырэкцыі студгарадка маецца план падрыхтоўкі будынкаў да зімовай эксплуатацыі. Але паспрабуем прайсціся па некаторых з інтэрнатаў.

Санітарны стан інтэрната № 5 у асноўным здавальняючы. Аднак патрэбна адзначыць—разводка труб цепласеткі патрабуе капітальнага рамонту. У душавых пакоях брудна, не хапае гумавых коўрыкаў, вадаправодныя краны не перакрываюцца. У нездавальняючым стане знаходзіцца ізалятар. Парушаюцца правілы санітарыі і проціпажарнай бяспекі. Захламлены запасны выхад. У многіх памяшканнях аконныя рамы проста згнілі, дэфармаваліся. У актавай зале не хапае шыб у вокнах.

А вось інтэрнат № 7. Чамусьці ў каменданта не знайшлося ключоў ад сталярнай майстэрні. А адзін з пакояў на першым паверсе яна не змагла адчыніць таксама з-за адсутнасці ключоў. Назначэнне яго ўвогуле не ўстаноўлена. Запасны выхад так застаўлены дыванамі, ложкамі, іншай мэбляй, што цяжка прайсці...

У інтэрнаце № 4 не ўсе пакоі радыёфікаваны. Неабходна правесці рамонт 30 дзвярэй, зашкліць каля 40 вокнаў у пакоях. На першым і другім паверхах не закончаны рамонт электраправодкі... І гэта толькі беглы пералік выяўленых недахопаў.

Хочацца спытаць у адміністрацыйна-гаспадарчай часткі, дырэкцыі студгарадка, камендантаў інтэрнатаў: калі ж усе гэтыя недахопы будуць ліквідаваны?

**Рэйдавая брыгада:**
**М. КАВАЛЁЎ,**
**Р. МІХНЕВІЧ,**
**М. КУЛЫГІНА,**
**К. КАРЗЮК.**

# Убачыць, спасцігнуць, зразумець...

У 1773 годзе ў Маскоўскай друкарні выйшла першая ў Расіі друкаваная арыфметыка. Складальнікам яе быў Лянцій Піліпавіч Магніцкі. У ёй упершыню выкарыстаны арабскія літары... Гэта кніга, як свяшчэнны помнік старжытнасці, захоўваецца ў бібліятэцы БДУ імя У. І. Леніна ў аддзеле рэдкай кнігі, загадвае якім Агнеса Андрэеўна Сінкевіч.

З кожным годам расце і пашыраецца фонд рэдкай літаратуры. Сёння ў ім захоўваецца 16 тысяч экземпляраў кніг: сярод іх старажытныя рукапісы, навуковыя працы, каштоўная мастацкая літаратура, манаграфіі, часопісы.

Інфармацыю я атрымала з гутаркі са студэнтамі гістарычнага факультэта, якія наведалі гэты «музейны куток» бібліятэкі. Не губляючы часу, адразу ж пайшла ў аддзел. Акінула позіркам выстаўкі. У мяне было жаданне ўсё адразу ўбачыць, спасцігнуць, зразумець...



З вялікай цікавасцю перагортваю адну кнігу, потым другую. Адчуваю, як акунаюся ў крыніцу думак, духоўна дакранаюся да здабыткаў чалавечага розуму. Кнігі захоўваюць у сабе таямніцы гісторыі, памяць народаў.

Адначасова са студэнткай гістарычнага факультэта Таццянай Яршовай мы падышлі да прац М. В. Ламаносава. Яго сачыненне «Древняя Российская история», выдадзенае ў 1766 годзе, выклікае павышаную цікавасць. У ім падрабязна расказваецца аб гісторыі Расіі, прыведзены яркія факты, якія практычна не сустракаюцца ў вучэбнай літаратуры.

Падыходжу да шкляной выставачнай вітрыны. Цэлая галерэя рэдкіх кніг, плеяда вядомых імён, карыфееў навукі. Гэтыя кнігі ішлі да нас доўгія гады, яны перажылі стагоддзі: «Русская летопись по Никонову списку», выдадзеная ў 1767 годзе, «Сатиры и другие стихотворческие сочинения» князя Антона Канцеміра з гістарычнымі заўвагамі і кароткім апісаннем яго жыцця, «Письма Петра Великого, писанные графу Борису Петровичу Шереметьеву», выдадзеныя у 1774 годзе...

Заўважаю, як студэнтка хоча падняць вялізную кнігу, не ведаючы, з якога боку да яе падступіцца. Падыходжу:

— Дазвольце, дапамагу?..

Здзіўляючая рэч, цэлая энцыклапедыя — «Россия в ее прошлом и настоящем» (1613—1913 гг.). Старонкі гэтага унікальнага шэдэўра расказваюць аб мінуўшым трохсотгоддзі.

Шмат цікавага захоўвае ў сабе гісторыя Беларусі. Аб ёй расказвае адзіная ў рэспубліцы кніга В. Жудро «Белынчский рождество - богородицкий монастырь», выдадзеная ў 1894 годзе. Побач з ёй на паліцы знаходзяцца «Белорусские народные песни»...

Мінулі стагоддзі, але час нічога не значыць для вялікіх ідэй, якія і зараз сучасныя, як сотні гадоў назад, калі яны былі выказаны ўпершыню. Гэта духоўны запавет аднаго пакалення другому. Сюды прыходзяць і будуць прыходзіць студэнты, каб «пагаварыць» з самымі лепшымі людзьмі мінулых часоў, пераняць вопыт, веды.

**І. БАРДЗІЯН.**

**На здымках:** А. А. Сінкевіч праводзіць экскурсію ў аддзеле рэдкіх кніг; старонкі гісторыі...

Фота **М. Дубовіка.**



# Ці вечны «шчаслівы білет?»

РЭПАРТАЖ

З АПОШНЯЙ ПАРТЫ

ДЛЯ НЕКАТОРЫХ СТУДЭНТАЎ няма нічога цяжэй, чым сядзець на лекцыі. І не спрачайцеся—бачылі! Нам давялося прысутнічаць у другакурснікаў гістфака на лекцыі па гісторыі СССР. Яшчэ і дваццаць хвілін не прайшло, а ўжо з «камчаткі» пачулася: «Колькі да званка?». Але ж вельмі цягнецца час, слухаць становіцца не па сілах, канспектаваць — тым больш. Што ж рабіць? А чаго там — якая-небудзь кніжка хутка замаскіроўваецца канспектам, твар самы сур'ёзны, і...

— Пачакайце, калі лекцыя нецікавая, навошта губляць час? Лепей займацца карыснай справай,—прапанаваў адзін з другакурснікаў. З ім згадзіліся многія — хто ўголас, а хто моўчкі.

Але мы падтрымліваць іх не збіраліся, бо толькі што бачылі іншы малюнак: большая частка студэнтаў займалася немаведама чым —па аўдыторыі «лёталі» запіскі, нехта дзяліўся сваімі навінамі, закаханыя віталі ў марах. Былі і такія, што проста сядзелі і глядзелі ў акно ці разглядалі паліцу таварыша...

А ў першакурснікаў — лекцыя па гісторыі КПСС. Некаторыя з іх прыйшлі ва універсітэт адразу ж пасля школы. Умення канспектаваць яшчэ не хапае. Адзін студэнт пажаліўся нават, што стаміўся ад мінулай лекцыі, і таму цяпер (па сакрэту скажам) ...маляваў.

У большасці сваёй першакурснікі маюць канспекты. І слухаюць яны ўважліва. Іх меркаванні грунтоўныя:

— Навошта чымсьці займацца на лекцыі? Трэба слухаць — жывое слова ўспрымаецца лепей, а канспект не дасць упусціць галоўнае.

Усё правільна. Толькі разам з гэтым хадзіў па руках на «камчатцы» часопіс з яркімі гумарыстычнымі малюнкамі. Ды выкладчык з дакорам сказаў аднаму са студэнтаў: «Вы, вы, малады чалавек! За апошняй партай! Чым там займаецеся?» На момант-другі адны звярнулі ўвагу на «сачка», другія — не... Лекцыя працягваецца.

А за акном дождж... Пойдзе снег, наблізіцца зімовыя экзамены. Потым пабягуць вясеннія ручайкі, закрасуюцца зялёныя лісточкі, дыхне май і... запахне летняй сесіяй. Вось тут і пабачым, для каго лекцыі сапраўды з'яўляюцца лекцыямі, а для каго— пасядзелкамі ці гуртком займальных спраў.

Пасля званка нам сказалі:

— Хто хоча ведаць прадмет, будзе і лекцыі слухаць, і чытаць дадатковую літаратуру. А калі толькі для заліку — хопіць і адной ночы. Павінна ж пашанцаваць на добры білет!

Вось і здараецца: выходзяць такі «маладыя спецыялісты» з дыпломам паранейшаму з надзеяй на шчаслівы білет... у жыцці.

**І. ЦАЛУЙКА,**
**Л. ТРАПЕЗНІКАВА.**

**АД РЭДАКЦЫІ:**

**Паразважай, паважаны чытач, што зрабіў ты [вы, ён, яна, яны], каб лекцыі не праходзілі безвынікова для тваіго інтэлектуальнага багажу, не трацілся дарэмна час! Памяркуй, выкажы сваю думку!**

● РАЗМОВЫ

# ДАРУЧЭННЕ

— Дзень добры, Іван Пятровіч, выклікалі?

— Выклікаў, Булкін, дзень добры! Ты што гэта, Булкін, на факультэце рэдка бываеш? Вучоба надакучыла, ці што?

— Што вы, Іван Пятровіч, адкуль? Я кожны дзень на факультэце, як штык,— з паловы дзевятай да чатырох.

— Ну, гэта ты кінь, Булкін, каго маніш? Што, я не бачу? Вось, напрыклад, Казяўкін з Фурсавым розную мэблю на факультэце кожную раніцу перацягваюць. Воўчык з Фікіным у марскі бой на маіх лекцыях гуляюць, нават пра перапынкі забываюць. Зюзін таксама бачны. Як ні сустрэнуся з ім на калідоры—усё папяросай пыхкае. Сам здзіўляюся, як гэта ён без адпачынку, я б не вытрымаў. Сузіна ў хоры спявае, Зуеў насценгазету малюе, Крупкін узносы збірае... Усе чымсьці заняты, бегаюць беспералынна, як апаленыя. А ты дзе, цікава, знаходзішся ў рабочы час, чым займаешся? Як паступіў ты да нас, з таго моманту і не бачна, як скрозь зямлю праваліўся.

— Дык я ж на лекцыях увесь час, Іван Пятровіч, слухаю, канспектую...

— Усе мы што-небудзь робім, Булкін, не гультайнічаем. Але ўсіх бачна, а цябе — не. Ты вось што, футболам цікавішся?

— А як жа...

— Давай тады з заўтрашняга дня збірай каманду і прыступай да арганізацыі футбольнага турніру. Ды паактыўней. Нельга ў баку ад усяго калектыву заставацца...

● ВЕСТКА З КАФЕДРЫ

**Няма нічога смяшней сур'ёзнага, і няма нічога сур'ёзней смешнага, таму гумар не трэба адрываць ад навукі.**

## ГАЛОЎНЫ ДОКАЗ

Выдатная пара — Аксіёма і Пастулат: ён ад яе не патрабуе ніякіх доказаў і яна ад яго. А па суседству з імі—Тэарэма і Аргумент. Яны ўвесь час спрачаюцца, штосьці даказваюць адзін аднаму. Хто з іх шчаслівейшы? Напэўна, Аксіёма і Пастулат. Але ў іх няма дзяцей, таму што толькі ў спрэчцы нараджаецца Ісціна...

## ФРАЗЫ

**Усякая самадзейнасць выдатная, калі яна пад мастацкім кіраўніцтвам.**

***

**Аксіёма — гэта ісціна, на якую не хапіла доказаў.**




Гумар жыў заўсёды. Людзі смяяліся нават яшчэ да нашай эры, калі па зямлі бегалі маманты. Але маманты вымерлі, а смех і жарты засталіся. Таму сёння мы прапануем гумарэску, якая была нядаўна знойдзена ў нашых жартаўнічых архівах.

● З НАШЫХ АРХІВАЎ

## МАРА СТУДЭНТА

**ПРАФЕСАР** (нясмела стукаецца у дзверы): **Дазвольце зайсці?**

**СТУДЭНТ** (пазяхаючы): **Заходзьце, прафесар.**

**ПРАФЕСАР** (уваходзячы): **Добрага здароўя, Пётр Міхалаевіч!**

**СТУДЭНТ: Добрага здароўя. Сядайце...**

**ПРАФЕСАР: Ці маглі б вы зараз здаць экзамен?**

**СТУДЭНТ: Гэта будзе залежаць ад вас.**

**ПРАФЕСАР: Дзякую. Бярыце, калі ласка, білет. Бярыце, бярыце, я не падглядваю... Які ў вас нумар?**

**СТУДЭНТ: Трыццаць другі... Ведаеце, прафесар, вам прыйдзецца зайсці ў другі раз!**

**ПРАФЕСАР: Ну, таварыш студэнт, я вас прашу...**

**СТУДЭНТ: Не!**

**ПРАФЕСАР: Я вельмі прашу.**

**СТУДЭНТ: Я сказаў — зойдзеце ў другі раз.**

**ПРАФЕСАР: А калі ў вас усё ж можна будзе прыняць экзамен?**

**СТУДЭНТ: Зловіце як-небудзь. Звычайна я бываю на факультэце па чацвяргах.**

**ПРАФЕСАР: Вялікае дзякуй... Прабачце... (Выходзіць).**



Без слоў...

ВІДАВОЧНАЕ — НЕВЕРАГОДНАЕ

## НУ І НУ!



У панядзелак пяцікурснік А. Грукаў устаў рана. За дзве гадзіны да першай пары. Ён прабег трусцой вакол інтэрната, памыўся, пагаліўся, паўтарыў па канспекту апошнія лекцыі, праслухаў ранішнія навіны, напісаў ліст дадому і, набіўшы вялікі партфель падручнікамі і сшыткамі, пакрочыў ва універсітэт. Там ён павітаўся з гардэробшчыцай, зайшоў у аўдыторыю і сеў за першы стол. Усю лекцыю ён уважліва слухаў выкладчыка. Канспектаваў кожнае яго слова. На перапынку ён пацікавіўся яго здароўем, здароўем яго сям'і, удакладніў незразумелыя пытанні, папрасіў спіс дадатковай літаратуры і заданне для больш расшыранай самастойнай работы па пройдзенай тэме. Пасля заняткаў А. Грукаў смачна паабедаў, пайшоў у бібліятэку, дзе перагледзеў, перагарнуў, заканспектаваў стос падручнікаў, навуковых работ, рэфератаў. Потым пайшоў у шахматна-шашачны клуб, на секцыю каратэ, у танцавальны- і фотагурткі, вечарам падзяжурыў у добраахвотніцкай дружыне, намаляваў насценгазету, напісаў верш, сустрэўся з дзяўчынаю, смачна павячэраў і ў дзесяць гадзін вечара заснуў. Але заснуў з думкай, што зрабіў вельмі мала, што можна было зрабіць больш і лепш...

ХРОНІКА

● ПРЫЕМНАГА АПЕТЫТУ!

**Каштоўную ініцыятыву праявіла студэнцкая сталовая № 6. Для таго, каб смачна пачаставацца ў ёй, трэба своечасова здаць на кухню кілаграм мяса, мяшок бульбы, дзве-тры цыбуліны...**

● ФУТБОЛ

Заўтра адбудзецца сустрэча футбольных каманд «Крышталь» і «Метэор». Гульня закончыцца ўнічыю. Але па пенальці пераможа «Метэор» — 4 : 3.

● МАЛАЙЦЫ, ШЭФЫ!

**Вось ужо паўгода шэфствуюць члены пажарнай аховы горада Рудзенска над студэнтам П. Стырыным. Адзін раз у месяц яны прыносяць яму ў інтэрнат стыпендыю, ходзяць за пакупкамі ў магазін, расказваюць аб апошніх падзеях на факультэце, здаюць залікі і экзамены.**

**Кафедру падрыхтаваў дацэнт Н. ЯРОБКІН.**



З ЦЫКЛА «ПЕРАМОЖЦЫ»

ФЕЛЬЕТОН

# ПРА ЛЫЖЫ, КАНЬКІ І ІНШАЕ...

ЗІМА СТУКАЕЦЦА Ў ДЗВЕРЫ. Стукаецца настойліва, патрабуе да сябе ўвагі. І не бяда, што не пакрыта яшчэ зямля мяккім снежным дыванам і ртутны слупок тэрмометра не жадае апускацца ніжэй нуля. Не бяда. Бо хутка, вельмі хутка зіма пачне сваё ўрачыстае шэсце, і тады... Тады адчуем мы, як прыемна пасля лекцый, практычных заняткаў ці бібліятэк адпачыць, падыхаць свежым марозным паветрам, прыхапіўшы з сабою надзейных зімніх сяброў — лыжы і канькі. І вельмі добра, калі сябры гэтыя заўсёды з вамі, калі не расстаецеся вы з імі ніколі, зберагаеце, дагледаеце. Цэлы год.

А калі не? Калі няма ў вас ні канькоў, ні лыжаў, а ёсць толькі вялікае жаданне, якое, як вядома, рэч вельмі і вельмі ўпартая. Што рабіць тады? Куды ісці? І, напэўна, доўга не раздумваючы, накіруецеся вы да адной з трох баз спартыўнага інвентару універсітэта. Радыёфізікі — на базу ў Шчомысліцах, філолагі — да сябе на факультэт, а студэнты іншых факультэтаў — да самай вялікай базы, што размясцілася ў падвальным памяшканні інтэрната № 6. Накіруецеся, і правільна зробіце. Толькі папярэдзім адразу: нічога з гэтага ў вас так і не атрымаецца. Бо не хапае на ўсіх базах лыжаў. Не хапае на ўсіх жадаючых. Нават для студэнтаў першых і другіх курсаў, якія павінны займацца фізічнай культурай нароўні з іншымі, не менш сур'ёзнымі і адказнымі дысцыплінамі, уключанымі ў агульны навучальны працэс.

Сапраўды, што такое 1090 пар лыжаў для шматтысячнай універсітэцкай сям'і? Ды і тыя, скажам прама, не зусім якасныя. Толькі ў мінулым навучальным годзе было спісана звыш 250 пар лыжаў! Гэта, пагадзіцеся, лічба вялікая. Становіцца яна яшчэ больш зразумелай, калі ўявіць сабе велізарную нагрузку, якую нясе штодзённа толькі адна пара лыжаў. Шэсцьвосем гадзін заняткаў запар. Увесь гэты час яна ў справе. Вынік — дрэва не вытрымлівае, трэскаецца, ламаецца. А калі дадаць да гэтага яшчэ і ўмовы захавання, напрыклад, на той жа самай базе спартыўнага інвентару, што ў інтэрнаце № 6, то агульны малюнак стане больш поўным і дакладным. Ноччу і днём тут беспярапынна капае са столі — у памяшканні нярэдка паяўляюцца велізарныя лужыны, а электрычная праводка ў аварыйным стане — хістаюцца на дрэнна ізаляваных правадах лямпачкі. І невядома, што раптам можа тут здарыцца адначасова: ці навадненне, ці пажар. А можа і ўсё разам.

А дзе канькі? Што з імі? А нічога. Бо што можа здарыцца з пустым месцам. Няма канькоў. Не, сказаць, што няма зусім — нельга. Крыху ёсць: 45 пар для хакейнай зборнай і 15 пар бегавых канькоў. І усё. А між іншым кожны год фігурыстэ ў розных справаздачах каток для масавага катання. Толькі для каго ён? Невядома.

Здаецца, дробязі. Але іменна з-за іх вось ужо сем год не праводзіцца спаборніцтвы на першынство універсітэта па хакею, каньках, біятлону. І адпаведна — колькасць жадаючых займацца ў гэтых секцыях вельмі абмежаваная. Гэта, безумоўна, уплывае на састаў зборных каманд, што таксама не можа не хваляваць. І ў першую чаргу кафедру фізічнага выхавання і спорту, адміністрацыйна-гаспадарчую частку універсітэта. Бо стукаецца зіма ў дзверы. Стукаецца настойліва і патрабуе, каб сустракалі яе па ўсіх правілах.


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

20 лістапада 1980 г.

Заказ 1723. АТ 19511

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14. ТЭЛЕФОН 22-07-19

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁУ